**Мароз, М.** Няма горшага, як чакаць / М. Мароз // Герой працы (Шуміліна). — 2000. — 15 лют. — С. 2.

## НЯМА ГОРШАГА, ЯК ЧАКАЦЬ



Мікалай Аляксандравіч Калянковіч, можна сказаць, скупы на ўспаміны. Асабліва, калі тычацца яны цяпер ужо далёкіх афганскіх падзей. Па натуры чалавек сціплы, ён не любіць хваліцца тым, што ў гады вайсковай службы прайшоў суровую школу Афгана. І калі ад яго ўдалося атрымаць мала звестак для артыкула ў газету, то дапамагла, бодльш пачуццёва і падрабязна расказала пра мужа Таццяна Савельеўна.

Сам Мікалай Аляксандравіч з далёкай Брэстчыны. Што падштурхнула юнака паехаць у Віцебск, паступаць у ТВ № 43? Ён прызнаецца, што трапілася ў рукі газета пра тэхнічнае вучылішча, нібыта адкрытае на базе КІМа, і можна стаць памочнікам майстра, вось гэта і падахвоціла ўчарашняга дзесяцікласніка рушыць з радзімы на Віцебшчыну.

Калі прасачыць жыццёвы ланцужок сям'і Калянковічаў, дык якраз Віцебск і стаў для Мікалая шчаслівым: тут, у вучылішчы, ён сустрэў сваё каханне – сваю будучую жонку, з якой сябравалі два гады. Пасля юнака забіраюць у армію. Служыў у войсках сувязі, у Маскоўскай ваеннай акрузе, прайшоў вучэбку, быў прызначаны камандзірам аддзялення, пасля стаў памочнікам камандзіра ўзвода. І ўсё ішло б ладком, магчыма, і даслужыў бы юнак у Саюзе свой вызначаны тэрмін. Аднак у адну са студзеньскіх начэй іх узнялі па трывозе, і камандзір палка аб'явіў задачу: «Выязджаем тэрмінова для аказання дапамогі ўраду ДРА». Полк пагрузілі у вагоны, якія ўжо чакалі на чыгунцы, і салдаты восем сутак дабіраліся да Тэрмеза.

Ехалі хлопцы вясёлыя, маладыя, дужыя, многія – пад уражаннем жаданага пісьма ад родных, ад сяброввак. І нават калі ў Тэрмезе іх рыхтавалі да адпраўкі за мяжу, нават тады ў Мікалая Калянковіча не ўзнікала падазрэнняў, што неўзабаве давядзецца прайсці цяжкае выпрабаванне. Калі ж байцы ўведалі, што іх чакае Афганістан, усё адно заспакойвала суцяшэнне камандавання: маўляў, нічога, хлопцы, страшнага, будзеце ахоўваць аб'екты, дапаможам братняму народу.

Да самага Кабула (а гэта амаль 600 кіламетраў) ехалі на сваіх машынах, дабіраліся дарогамі-серпанцінамі да самага сэрца афганскай вайны. Ужо тады, у 80-м, адчуваўся подых гэтых страшных падзей, ужо тады хлопцы з жахам глядзелі на разбураны Палац Аміна, праз нейкі час убачылі параненых, і загінуўшых сваіх суайчыннікаў, якіх адпраўлялі на Радзіму ў цынкавых трунах. Але каб стыла кроў ад жаху – такога ў Мікалая Калянковіча не было. І неслі службу (а за паспяховы пераход праз мяжу камандуючы Туркестанскай ваеннай акругай прысвоіў Мікалаю пазачарговае званне старшыны), і спалі трывожна, нават са зброяй: усё ж чужына ды вайна, а ўсё адно ніколі Мікалай Калянковіч не змаладушнічаў, заўсёды быў у гушчыні падзей. Расказваў, хаця і скупа, і пра забеспячэнне ў Афганістане, і пра ваенныя дзеянні... А вось калі сказалі, што неўзабаве будзе «дэмбель», узрадаваўся так, як ні радаваўся ніколі ў жыцці. Калі перасякалі граніцу, калі ляцелі ў Ташкент, хлопцы ў самалёце расчуліліся да слёз.

– Цяжка было, – прызнаецца М. А. Калянковіч. – А вось Таццяне маёй было яшчэ горш. Яна чакала...

Так, Таццяна Савельеўна чакала мужа з вайны. Менавіта з вайны, хаця адчула, што адправілі Мікалая ў Афганістан толькі тады, калі перасталі ад яго ісці пісьмы, тады занепакоілася, жахнулася: ай-ёй, адправілі ж у самае пекла! Сама яна з Шумілінdriveшчыны, бацькі жывуць у райцэнтры, і яна, жывучы ў бацькоўскай хаце, не раз стоена плакала, магчыма, і маліла за хлопца, з якім параднілася, ад яго чакала дзіця. Але гэта было пазней, гэта было перад тым, як прыйшоў юны бравы салдат у водпуск. Узмужнелы, з салдацкай выпраўкай, ён прыехаў у Шуміліна. Таццяна чакала дзіця, і салдат паехаў у вайсковую часць, так і не дачакаўшыся свайго першынца. Затое калі атрымаў вестку, што ў яго нарадзіўся сын, плакаў ад радасці, падскокваў, як кажуць, вышэй столі. Усё-такі сын!

Т. С. Калянковіч больш гаваркая, чым яе муж. Яна ахвотна расказвала пра свае перажыванні, расказвала па-жаночы цёпла і сардэчна. Яна нават не схавала многіх дэталяў, расказала пра той памятны майскі дзень, калі Мікалай вярнуўся дамоў са службы. У той час яна працавала на пошце, папрасіла замяніцца сваю сяброўку. А сама стрымгалоў паляцела дадому. Гэта трэба, мусіць, перажыць такое самому, каб зразумець жаночую радасць, радасць жонкі, якая сустракае з вайны здаровага, з рукамі ды нагамі любімага чалавека. Ды якога чалавека – з шырокай паласой старшыны на пагонах.

Мікалай быў у роздуме: куды падацца пасля вайсковай службы. У Віцебск? Зноў на КІМ, дзе працаваў да арміі памочнікам майстра? Не, з такімі варыянтамі ён не згаджаўся. Хацелася знайсці работу тут, на месцы, каб не калясіць па свеце, не шукаць нейкага ўяўнага шчасця. Кватэры сваёй не было, але на першым часе можна было перабыць у цешчы. Балазе дом у яе вялікі, свой, і часова можна пажыць тут. І пайшоў Мікалай Калянковіч у органы МУС. Цяпер ён камандзір аддзялення службы аховы, жонка, Таццяна Савельеўна, працуе ў АПБ загадчыцай касы. Яна і расказала пра свае жыллёвыя пакуты. Маладой сям'і хацелася мець свой вугал. Як і кожнай, якая збіраецца стаць на самастойныя рэльсы жыцця і жыць незалежна ад бацькоў, на свае заработкі. Якая была вялікая радасць для Калянковічаў, калі ад сувязі ім далі жыллё. Праўда, дом быў на чатыры сям'і, без зручнасцей, але ўсё адно пераязджалі з радасцю. І толькі ў 1997 годзе Мікалай Аляксандравіч Калянковіч, як афганец атрымлівае добрую кватэру з усімі зручнасцямі.

– Мы, калі праўду казаць, – расказвае Т. С. Калянковіч, – дык і выгадавалі дзяцей у нялёгкіх умовах. А цяпер, калі яны дарослыя, мы займелі сапраўды добрую кватэру.

На нейкі момант на яе твары чытаецца сумны адбітак, але ўсё ж яна згадвае нешта цікавае і дадае:

– Я ўспомніла, як Коля вярнуўся са службы. Худы такі, загарэлы, ну, як негр. А Сашку тады было крыху больш за год. І ён ўсё ходзіць каля гэтага, даруйце, негра, і ўсё ляпеча: «Дзядзя, дзядзя». Тады мама мая і гаворыць: «Сашка, дык гэта ж твой тата»...

Здаецца, такія розныя па характары людзі – Таццяна і Мікалай, а ўсе ж па іхніх тварах адчуваецца, што жывуць яны шчасліва, жывуць у згодзе. І нават без прызнання Таццяны Савельеўны ў тым, што і сёння пачуцці ў іх не згаслі, – і без гэтага ясна: шчаслівыя людзі. Шчаслівыя сваёй памяркоўнасцю, шчаслівыя сынамі, якіх выпеставалі і вывелі ў людзі. Старэйшы, Аляксандр, на чацвёртым курсе Наваполацкага універсітэта, будучы эканаміст; малодшы, Сяргей, вучыцца ў Лужаснянскім сельгастэхнікуме, вучыцца на агранома. Ён, можа, і падленьваўся крыху ў

вучобе, але сказаў бацькам: «Закончу тэхнікум, пайду ў акадэмію». Няхай бы так і было, няхай хлопец вучыцца, бо без ведаў сёння – нікуды.

Не ведаю, ці выпытвалі што ў бацькі Аляксандр і Сяргей пра афганскія падзеі. Ды гэта няважна. Важна іншае: яны могуць ганарыцца сваім бацькам, сваёй маці – людзьмі шчырымі, ветлівымі і прыстойнымі.

**М. Мароз**